## *Дыскусіі*

*І.П. КЛІМАЎ*

# БЕЛАРУСКІ ПОГЛЯД НА СПРАВУ «ЎКРАІНІЗАЦЫІ» ЧЭЦЦІ 1489 г.

Рассматриваются особенности известного памятника «руськой» письменности, Четьи 1489 г., которые прежде принимались за украинизмы. Даются иные объяснения этих особенностей (главным образом как аналогические образования или лексические варианты церковнославянского языка) и показывается ошибочность прежнего взгляда на них как на украинизмы. Указывается на необходимость более внимательного и систематического изучения этого памятника письменности.

The famous script of the Ruthenian writing, the 1489 Chettya (a lectionary collection of sermons, and saints' lives) is under review. Its peculiarities which were formerly taken as the Ukrainisms are critically examined and explained in a different way, chiefly as analogous formations or lexical variants of the Church Slavic language. The former view on the script as one with Ukrainianisms is erroneous, what requires more careful and systematic research of the Chettya.

У апошнія дзясяцігоддзі назіраюцца настойлівыя спробы некаторых украінскіх лінгвістаў перапісаць супольную моўную гісторыю беларускага і ўкраінскага народаў эпохі Сярэднявечча і ранняга Новага часу. Пісьмовыя помнікі, агульныя для культурнай і моўнай спадчыны абодвух народаў, абвяшчаюцца ўкраінскімі, а помнікі, што раней у навуцы вызнаваліся за беларускія, прызнаюцца таксама ўкраінскімі. Апошняе робіцца нібыта ў выніку навуковага разгляду, аднак яго метадалогія выклікае сур'ёзную крытыку (гл. Свяжынскі 2003), а самі працэдуры, што выкарыстоўваюцца пры гэтым, нагадваюць хутчэй маніпуляцыі.

Адным з помнікаў, што стаў аб'ектам такой «украінізацыі», з'яўляецца так званая Чэцця 1489 г. Яна ўяўляе сабой фактычна саборнік, ці святочнік (таржэсцвеннік) – зборнік казанняў і жыццяў на царкоўныя святы года (гл. Перетц 1928, 8). Помнік дакладна датаваны (калі дата «1489» – не падробка XIX ст. ці не механічна перапісаны запіс пратографа(ў) Чэцці) і лічыцца найбольш раннім прыкладам пранікнення народна-гутарковай стыхіі ў рэлігійную сферу (Там жа, 1). Відаць, менавіта таму помнік зрабіўся аб'ектам павышанай увагі вучоных. У кнізе перапісчык пакінуў уласны запіс: *Списана бы$^{ст}$ кніга сиія нарицаемая четыія. въ градѣ оу камянци при великомъ короли андрѣи. В лѣт ѕцечз индикта .въ з. а тогды держалъ ѡ$^{т}$ короля камянець. панъ третина. кухмистръ. А пса$^{л}$ сію книгоу нѣхто е$^{ст}$ березка з нова горо$^{д}$ка лито$^{в}$ско$^{г}$ поповичь попа литово$^{ч}$ко$^{г}$ снь семиѡновъ дольбнича и$^{ж}$ в нитрополии* (арк. 286 адв.; Карпинский 1889, 61; Перетц 1928, 4–5), няясна, дзе тады змяшчалася рэзідэнцыя Кіеўскай мітраполіі – у Навагрудку ці Кіеве; пад Камянцом украінскія вучоныя прапануюць бачыць Камянец-Падольскі; кароль Андрэй – гэта Андрэй Казімір, вялікі князь ВКЛ і кароль польскі († 1492). Іншая прыпіска зроблена ў 1686 г. у сувязі з аправай кнігі, выкананай *Іѡано$^{м}$ Саковичом Пре$^{с}$б: Воин$^{с}$ким Мѣсцки$^{м}$ а куплена есть ѡ$^{т}$ вел. ѡца Ваши$^{н}$ского...* (арк. 287), пад гэтай Воінню бачаць Вогінь (польск. *Wohiń*, у даўніх актах таксама *Woiń*, *woiński*) на Холмшчыне (памылкова некаторыя даследчыкі лічаць Воінь месцам перапіскі (гл. Воронич 2008, 41; Воронич 2008 [а], 244)). Упершыню помнік стаў вядомы навуцы ў 1880 г. (перад тым яго адшукаў інспектар Бельскай настаўніцкай семінарыі на Падляшшы) і зараз захоўваецца ў Кіеве (Нацыянальная бібліятэка Украіны імя В.І. Вернадскага, шыфр ДА/415 л). Помнік мае значны памер (375 арк.), але распадаецца на дзве няроўныя часткі (першая займае пачатковыя 287 арк.), адрозныя паводле почырку і зместу, але аднолькавыя паводле мовы і правапісу (гл. Перетц 1928, 21). Помнік не выдадзены, за выключэннем жыція Барыса і Глеба (гл. Карпинский 1889, 87–106) і асобных фрагментаў (гл. Перетц 1928, 6–8, 9–11, 13–21, 35–37, 42–89, 91–93, 95–100; пра іншыя публікацыі гл. Перетц 1928, 2–3). Мова зборніка вывучалася многімі даследчыкамі (гл., напрыклад: Карпинский 1889, 63–76, 85–86; Перетц 1928, 5–6, 21–30; Жураўскі 1967, 84–89; Жураўскі 1994), якія прыйшлі да высновы, што помнік уяўляе сабой беларускую копію першапачаткова ўкраінскага пратографа. На іх думку, у мове спалучаюцца беларускія і ўкраінскія рысы, што абумоўлена складаным генезісам помніка. Пры перапісцы рабіліся скарачэнні многіх твораў, што ўвайшлі ў склад зборніка (гл. Перетц 1928, 12), адбывалася гласаванне (у тым ліку і праз перапраўленне, але часта пазнейшым почыркам) ці сінанімізацыя асобных слоў тэксту (Там жа, 30–33). Аднак некаторыя ўкраінскія лінгвісты ў многім аспрэчылі гэтыя высновы і цяпер лічаць помнік цалкам украінскім (гл. Гринчишин 1995; Воронич 2008; Воронич 2008 [а]). На гэтай падставе яшчэ на пачатку 1990-х гг. помнік быў уключаны ў корпус «Словника української мови XVI – першої пол. XVII ст.», нягледзячы на тое, што гэта парушала храналогію слоўніка. Раней, у 1960–1970-х гг., Л. Гумецкая адхіліла гэты помнік у якасці крыніцы для свайго «Словника староукраїнської мови XIV–XV ст.».

Але высілкі па настойлівай «украінізацыі» Чэцці пакуль застаюцца непераканаўчымі – галоўным чынам як з-за хісткасці дыялектных інтэрпрэтацый, што робяцца ўкраінскімі лінгвістамі, так і з-за даволі заганнай метадалогіі, што выкарыстоўваецца імі для абгрунтавання сваёй пазіцыі. Перш за ўсё яны не ўлічваюць сінкрэтычнай моўнай прыроды помніка. У ім мяшаюцца ўсходнеславянскія і царкоўнаславянскія рысы –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

доля апошніх усё яшчэ вельмі вялікая (гл. Гринчишин 1995, 255–258, 259, 265, 266; таксама гл. Жураўскі 1967, 84, 89). Таму многія асаблівасці ці непаслядоўнасці трэба тлумачыць на глебе царкоўнаславянскай мовы, а не дыялектным уплывам. Па-другое, многія ўкраінізмы, што бачацца ўкраінскім даследчыкам (гл. Гринчишин 1995, 274; Воронич 2008, 46; Воронич 2008 [а], 247–248), – вынік некарэктнага, часам тэндэнцыйнага, а то і проста памылковага тлумачэння моўнага матэрыялу. Далей дзеля тэрміналагічнай карэктнасці супольная літаратурна-пісьмовая мова беларусаў і ўкраінцаў XIV–XVIII стст. называецца «руськай», а тэрміны «беларускі» ці «ўкраінскі» адносяцца толькі да дыялектаў або да геаграфіі.

Найперш неабходна разгледзець праявы ў Чэцці найбольш выразных рыс, што вылучаюць украінскі ўплыў і супрацьпастаўляюць яго беларускаму. Да ліку такіх рыс адносяцца толькі фанетычныя (фанетыка-арфаграфічныя) з'явы, з якіх найбольш паказальныя – рэфлекс прасл. *ě > *і*, блытаніна літар **і/и ~ ы**, пераход *о*, *е* > *и*. Адсутнасць гэтых з'яў аўтаматычна «аддае» мову помніка беларускаму арэалу і закрывае пытанне пра яго ўкраінскую дыялектную аснову.

Выпадкі ўжывання *і* на месцы прасл. *ě прадстаўлены непаказальнымі прыкладамі, якія ўсе цалкам могуць быць вытлумачаныя дзеяннем аналогіі: *вси*, *всих*, *всим* – гэтыя формы вядомыя і маскоўскаму пісьменству (параўн. бел. *усіх*, *усім*), ці кантамінацыі розных асноў: *пересмиханья* (параўн. бел. *усміхацца*), *цвисти* 'квітнець' (*зацвила*, *процвитет*, *процвитох*, *процвитенье*), параўн. бел. *зацвіла*, *зацвіў*, *цвіце*; *свитающю* (параўн. бел. *світанак*, *на досвітку*), або канчаткаў: *в дорози*, *Никити* – канч. *-і* у Д., М. адз. л. уласцівы таксама беларускім дыялектам. Кантамінацыю розных слоў – *ведати* і *видети* – уяўляюць сабой напісанні кшталту *свидительствуеть*, *срдцевидець*, вядомыя не толькі «рускаму», але і царкоўнаславянскаму пісьменству. Таксама царкоўнаславянскі ўплыў адлюстроўваюць напісанні кшталту *змии*, *змииного*, *змию*. Усе падобныя выпадкі ўкраінскія даследчыкі недальнабачна лічаць украінізмамі (гл. Гринчишин 1995, 266), аднак у іх няма нічога спецыфічна ўкраінскага, падобныя з'явы трапляюцца таксама ў маскоўскіх рэлігійных помніках XIV–XVI стст., дзе пра ўкраінскі ўплыў не можа быць і мовы.

Малое значэнне маюць выпадкі напісання ў Чэцці так званай новай ѣ, якая адзначана пераважна ў суф. *-ѣнье/-ѣние* (Перетц 1928, 24–25; Жураўскі 1967, 85; Гринчишин 1995, 267) і пры пэўных умовах для пазначэння літары **і/и** (гл. Карпинский 1889, 65–66). Апошняе ў Чэцці сустракаецца пераважна ў тэматычных суфіксах дзеясловаў – у формах загаднага ладу, цяперашняга і прошлага часу: *любѣм*, *хвалѣм*, *молѣмся*, *веселѣмся*; *молѣте*, *говорѣте*, *скажѣте*; *оскорбѣл*, *творѣла* (Карпинский 1889, 67; Гринчишин 1995, 267–268; Воронич 2008, 44), што ўжо не можа разглядацца толькі як украінізм. Насамрэч, абедзве сітуацыі могуць быць толькі арфаграфічнай звычкай царкоўнага пісара (у выпадку Чэцці – паповіча!), які меў справу з украінскімі рукапісамі (у тым ліку царкоўнаславянскімі) і быў знаёмы са значэннем літары Ѣ як [і], але не ведаў, як яе правільна выкарыстоўваць. Праўда, помніку часткова ўласціва правільнае выкарыстанне літары ѣ (гл. Гринчишин 1995, 269), аднак гэтая прыкмета можа быць вынікам толькі ўважлівага капіравання пратографа(ў).

Але нават калі згадзіцца з украінскімі даследчыкамі і прызнаць наяўнасць у помніку рэфлексу прасл. *ě > *і*, то як тады ўспрымаць іх заявы і пра ўкраінскі (ці паўночнаўкраінскі) характар рэфлексу прасл. *ě > *е*, прадстаўленага шматлікімі выпадкамі: *беду*, *века*, *видели*, *грехов*, *девицю*, *(до)ехал*, *разделил*, *телу*, *река*; *вѣре*, *мѣсце*, *в законе*, *на иконе*, *на светиле* і пад. (Гринчишин 1995, 272; Воронич 2008, 44; Воронич 2008 [а], 247)? Як у адной гаворцы перапісчыка Чэцці (ці стваральніка яе пратографа) маглі аднаразова сумяшчацца абодва рэфлексы? Пазіцыя ўкраінскіх навукоўцаў, што ці не любую рысу імкнуцца абвясціць украінскай, прыводзіць у гэтым выпадку да моўнай ідыясінкразіі.

Такая на першы погляд вельмі паказальная рыса, як блытаніна літар **і/и ~ ы**, далёка не ва ўсіх выпадках адлюстроўвае ўкраінскі ўплыў (гл. Клімаў 2009, 149), як упэўнена лічыць Г. Вароніч (гл. Воронич 2008, 44). Па-першае, такая блытаніна была ўласцівая і ўласна беларускім помнікам пад літоўскім уплывам, паколькі ў літоўскай мове не адрозніваліся гукі [і] і [у] (гл. Зинкявичюс 1996, 73). Таму блытаніна гэтых літар сустракаецца ў многіх паўночнабеларускіх і літоўскіх помніках «руськага» пісьменства, дзе ўкраінскага ўплыву няма зусім. Відаць, у сувязі з гэтым стаіць і ўласцівая амаль усім «руськім» помнікам блытаніна ў каранях такіх слоў, як *ныне ~ нине*, *тисеча ~ тисеча*, *дыра ~ дыра* (апошняя пара ўласціва таксама царкоўнаславянскаму пісьменству). Па-другое, у некаторых выпадках блытаніна гэтых літар абумоўлена фаналагічнымі асаблівасцямі беларускай мовы: зацвярдзеннем *r'* (адсюль шматлікія хістанні кшталту *крити ~ крыти*, *риза ~ рыза*, *который ~ которий*, *добрый ~ добрий*), шыпячых і *с'* (адсюль хістанні кшталту *моцы ~ моци*). Па-трэцяе, няма ўкраінскага ўплыву ў хістанні канчаткаў асобных іменных формаў, дзе ў множным ліку выступалі ранейшыя родавыя канчаткі: а) Н. мн. л. назоўнікаў кшталту *народы ~ народи*, *ангелы ~ ангели*, *ризы ~ ризи*; б) Н. мн. л. (дзее)прыметнікаў кшталту *готовы ~ готови*, *видены ~ видени*. Сюды трэба аднесці і хістанне канчаткаў у старых формах Т. мн. л. кшталту *делы ~ дели*, якое адзначаецца ў Чэцці. У помніку якраз

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

прысутнічаюць толькі акрэсленыя вышэй выпадкі: *ныне* ~ *нине*, *тисящь* ~ *тысячами*; *рикающа*, *крилъ*, *злыи* ~ *злии*, *святыи* ~ *святии* і пад. (Карпинский 1889, 69), якія не магчыма аднесці на кошт украінскага ўплыву (гл. Гринчишин 1995, 266), а трэба лічыць вынікам марфалагічнага выраўноўвання. Украінскім даследчыкам трэба быць больш абачлівымі ў сваіх высновах і не ўсялякую блытаніну літар **і/и ~ ы** (асабліва калі яна адзначаецца толькі ў пэўных марфалагічных формах) прызнаваць украінізмам.

Таксама памылковай з'яўляецца выснова наконт украінскага паходжання ўжывання *и* замест *о* ці *е* ў такіх словах Чэцці, як *апустолом*, *(архи)епискуп(ство)*, параўн.: *архиепискупа*; *откуль/откуле*, *оттуль/оттуле*, *отсюль/отсюле*, а таксама ў формах *занюжь/зануж*, *нюжли/нужли* (Гринчишин 1995, 267; Воронич 2008, 44). Гэта штучнае аб'яднанне абсалютна розных выпадкаў, толькі знешне падобных да ўкраінскага «укання», але насамрэч ніякай сувязі з ім не маючых. У некаторых украінскіх дыялектах сапраўды назіраецца пераход *о*, *е* > *и*, але толькі ў пэўнай фанетычнай пазіцыі: у закрытым складзе, перад складам са слабым рэдукаваным галосным (гл., напрыклад, Клімаў 2009, 150). Таму выпадкі кшталту *архиепискупа*, *откуле*, *оттуле*, *отсюле* ўжо ніяк не могуць тлумачыцца як такія ўкраінізмы. Яны ўяўляюць сабой хутчэй факты лексікі: прыслоўі *откуль/откуле* і пад. калі не з'яўляюцца паланізмамі, то маюць суфікс *-улы/-уле* (параўн. бел. *адкуль*, *адтуль*, *дасюль*, *адсюль* і пад.), у грэцызмах грэч. *ō* ў царкоўнаславянскай мове нярэдка перадаваўся літарай **у**, вынікам чаго былі формы *епискупъ*, *Соломунъ*, *икуна* 'ікона', *номоканунъ* і пад., параўн. таксама польск. *biskup*, бел. *біскуп*. Напісанне *апустолом* можа быць апіскай або абумоўлена паўднёваславянскім уплывам (параўн. сербск. *апустол*, *апустолски*). Словы *занюж*, *нюжли* ў сваім складзе маюць заканамерную форму В. адз. л. ж. р. адноснага займенніка *иже*, якая пасля прыназоўніка, найчасцей пасля *въ* (< **vъn*), атрымала ўставку *-н-* (параўн. суадноснае црксл. *въ ню*), а напісанні *зануж*, *нужли* – іх дыспалаталізаваныя варыянты, што ўзніклі, відаць, пад паўднёваславянскім уплывам (блытаніна літар **у ~ ю**, **а ~ я** і г. д. уласцівая многім сербскім і заходнебалгарскім (македонскім) помнікам). Думка пра «уканне» ў гэтых формах належыць У. Перацу (гл. Перетц 1928, 6, 24) і нарадзілася, відаць, пры памылковым суаднясенні іх з царкоўнаславянскімі злучнікамі *зане(ж)*, *неж(е)ли*; размовы пра дыфтангічны характар гука тут (гл. Воронич 2008, 44) увогуле беспадстаўныя.

Іншыя фанетычныя асаблівасці помніка, што абвяшчаюцца ўкраінскімі, насамрэч не ўласцівыя асноўнаму масіву ўкраінскіх гаворак і адзначаюцца ў ім на перыферыі ці спарадычна ў некаторых гаворках. Да такіх рыс адносяцца адлюстраванне асіміляцыйнай глухасці: *свѣтки*, *свѣтчить* (насамрэч, гэтае слова са спалучэннямі *тк*, *тч* – устойлівае напісанне актавай мовы (гл. Клімаў 2009, 151) і еканне: *светые*, *жедаеш*, *уведати*, *помнечи*, *терпечи*, *говоречи*, *тисечника*, *ерополк* і пад. (Карпинский 1889, 67; Гринчишин 1995, 271–272; Воронич 2008, 43–44; Воронич 2008 [а], 246–247). Апошняя рыса ўласціва амаль усім «руськім» помнікам канца XV – сярэдзіны XVII ст. (аднак адзначаецца з канца XIV і да пачатку XVIII ст.), але наўрад ці мае дыялектнае паходжанне (насуперак думцы большасці ўкраінскіх лінгвістаў, хаця некаторыя з іх лічаць яе беларусізмам (гл. Півторак 2007, 767)). Вялікага значэння не маюць выпадкі адлюстравання ў Чэцці мяккасці *с'*: *венець*, *месяць*, *девицю*, *темницю* і пад. (Гринчишин 1995, 268–269) – гэта можа быць толькі правапіснай тэндэнцыяй (параўн. паланізм *моць* з такім напісаннем), тым больш, што ў помніку зрэдку сустракаюцца напісанні і формы, якія адлюстроўваюць зацвярдзенне гэтага зычнага: *девица*, *пятница*, *творца*, *борца*, *борцомъ*, *молодцы* і інш. Ці варта казаць, што абедзве постаці – і з мяккім *с'*, і з зацвярдзелым (таксама як і *r' – r* (гл. Гринчишин 1995, 261–262)) – лінгвісты Украіны прызнаюць украінскім уплывам (цікава, як яны маглі спалучацца ў маўленні адной асобы?).

Рэдкія выпадкі гіперычнага окання (*распадолося*, *борана*, *двожды* і пад.) украінскімі вучонымі лічацца асаблівасцю правабярэжных ніжненадпрыпяцкіх палескіх гаворак, даследаваных у свой час Т. Назаравай (гл. Гринчишин 1995, 259; Воронич 2008, 43), хаця гэтая арфаграфічная з'ява ўласцівая ўсім беларускім помнікам, а таксама маскоўскаму пісьменству. Больш частыя выпадкі акання (*багата*, *вчарашнии*, *ласкаво*, *карамольное*, *моланья*, *подабаеть*, *паганым*, *радаватися* і пад. (Карпинский 1889, 68; Перетц 1928, 24)) у Чэцці вельмі праблематычна звязаць з украінскім уплывам (гл. Гринчишин 1995, 270–271; Воронич 2008, 42–43; Воронич 2008 [а], 245–246), паколькі ва ўкраінскай мове нешматлікія выпадкі акання (толькі ў пераднаціскным складзе) кшталту *багатий*, *гаразд*, *гарячий*, *хазяїн* маюць выключна лексікалізаваны выгляд і прызнаюцца вынікам беларускага ўплыву (гл. Півторак 2007, 767). З аканнем не маюць нічога агульнага выпадкі ўжывання *-а-* ў каранях дзеясловаў незакончанага трывання (*розмавляти*, *помагати*, *ламати*, *выганяти*, *розмнажати* і пад.), якія беларускія даследчыкі дружна лічаць праявам акання, – такія формы насамрэч абумоўлены польскім уплывам і адзначаюцца ў польскіх помніках (*rozmawiać*, *pomagać*, *łamać*, *wyganiać*, *rozmnażać* і пад. (Клімаў 2009, 151)). Доказам акання таксама не павінны служыць запазычанні кшталту *манастырь*, *карабль*, *панамарь* і пад., дзе вы-

РЕПОЗІТОРЫЙ БДПУ

доля апошніх усё яшчэ вельмі вялікая (гл. Гринчишин 1995, 255–258, 259, 265, 266; таксама гл. Жураўскі 1967, 84, 89). Таму многія асаблівасці ці непаслядоўнасці трэба тлумачыць на глебе царкоўнаславянскай мовы, а не дыялектным уплывам. Па-другое, многія ўкраінізмы, што бачацца ўкраінскім даследчыкам (гл. Гринчишин 1995, 274; Воронич 2008, 46; Воронич 2008 [а], 247–248), – вынік некарэктнага, часам тэндэнцыйнага, а то і проста памылковага тлумачэння моўнага матэрыялу. Далей дзеля тэрміналагічнай карэктнасці супольная літаратурна-пісьмовая мова беларусаў і ўкраінцаў XIV–XVIII стст. называецца «руськай», а тэрміны «беларускі» ці «ўкраінскі» адносяцца толькі да дыялектаў або да геаграфіі.

Найперш неабходна разгледзець праявы ў Чэцці найбольш выразных рыс, што вылучаюць украінскі ўплыў і супрацьпастаўляюць яго беларускаму. Да ліку такіх рыс адносяцца толькі фанетычныя (фанетыка-арфаграфічныя) з'явы, з якіх найбольш паказальныя – рэфлекс прасл. *ě > *і*, блытаніна літар **і/и ~ ы**, пераход *о*, *е* > *и*. Адсутнасць гэтых з'яў аўтаматычна «аддае» мову помніка беларускаму арэалу і закрывае пытанне пра яго ўкраінскую дыялектную аснову.

Выпадкі ўжывання *і* на месцы прасл. *ě прадстаўлены непаказальнымі прыкладамі, якія ўсе цалкам могуць быць вытлумачаныя дзеяннем аналогіі: *вси*, *всих*, *всим* – гэтыя формы вядомыя і маскоўскаму пісьменству (параўн. бел. *усіх*, *усім*), ці кантамінацыі розных асноў: *пересмиханья* (параўн. бел. *усміхацца*), *цвисти* 'квітнець' (*зацвила*, *процвитет*, *процвитох*, *процвитенье*), параўн. бел. *зацвіла*, *зацвіў*, *цвіце*; *свитающю* (параўн. бел. *світанак*, *на досвітку*), або канчаткаў: *в дорози*, *Никити* – канч. -*і* у Д., М. адз. л. уласцівы таксама беларускім дыялектам. Кантамінацыю розных слоў – *ведати* і *видети* – уяўляюць сабой напісанні кшталту *свидительствуеть*, *срдцевидець*, вядомыя не толькі «рускаму», але і царкоўнаславянскаму пісьменству. Таксама царкоўнаславянскі ўплыў адлюстроўваюць напісанні кшталту *змии*, *змииного*, *змию*. Усе падобныя выпадкі ўкраінскія даследчыкі недальнабачна лічаць украінізмамі (гл. Гринчишин 1995, 266), аднак у іх няма нічога спецыфічна ўкраінскага, падобныя з'явы трапляюцца таксама ў маскоўскіх рэлігійных помніках XIV–XVI стст., дзе пра ўкраінскі ўплыў не можа быць і мовы.

Малое значэнне маюць выпадкі напісання ў Чэцці так званай новай ѣ, якая адзначана пераважна ў суф. -*ѣнье*/-*ѣние* (Перетц 1928, 24–25; Жураўскі 1967, 85; Гринчишин 1995, 267) і пры пэўных умовах для пазначэння літары **і/и** (гл. Карпинский 1889, 65–66). Апошняе ў Чэцці сустракаецца пераважна ў тэматычных суфіксах дзеясловаў – у формах загаднага ладу, цяперашняга і прошлага часу: *любѣм*, *хвалѣм*, *молѣмся*, *веселѣмся*; *молѣте*, *говорѣте*, *скажѣте*; *оскорбѣл*, *творѣла* (Карпинский 1889, 67; Гринчишин 1995, 267–268; Воронич 2008, 44), што ўжо не можа разглядацца толькі як украінізм. Насамрэч, абедзве сітуацыі могуць быць толькі арфаграфічнай звычкай царкоўнага пісара (у выпадку Чэцці – паповіча!), які меў справу з украінскімі рукапісамі (у тым ліку царкоўнаславянскімі) і быў знаёмы са значэннем літары Ѣ як [і], але не ведаў, як яе правільна выкарыстоўваць. Праўда, помніку часткова ўласціва правільнае выкарыстанне літары ѣ (гл. Гринчишин 1995, 269), аднак гэтая прыкмета можа быць вынікам толькі ўважлівага капіравання пратографа(ў).

Але нават калі згадзіцца з украінскімі даследчыкамі і прызнаць наяўнасць у помніку рэфлексу прасл. *ě > *і*, то як тады ўспрымаць іх заявы і пра ўкраінскі (ці паўночнаўкраінскі) характар рэфлексу прасл. *ě > *е*, прадстаўленага шматлікімі выпадкамі: *беду*, *века*, *видели*, *грехов*, *девицю*, *(до)ехал*, *разделил*, *телу*, *река*; *вѣре*, *мѣсце*, *в законе*, *на иконе*, *на светиле* і пад. (Гринчишин 1995, 272; Воронич 2008, 44; Воронич 2008 [а], 247)? Як у адной гаворцы перапісчыка Чэцці (ці стваральніка яе пратографа) маглі аднаразова сумяшчацца абодва рэфлексы? Пазіцыя ўкраінскіх навукоўцаў, што ці не любую рысу імкнуцца абвясціць украінскай, прыводзіць у гэтым выпадку да моўнай ідыясінкразіі.

Такая на першы погляд вельмі паказальная рыса, як блытаніна літар **і/и ~ ы**, далёка не ва ўсіх выпадках адлюстроўвае ўкраінскі ўплыў (гл. Клімаў 2009, 149), як упэўнена лічыць Г. Вароніч (гл. Воронич 2008, 44). Па-першае, такая блытаніна была ўласцівая і ўласна беларускім помнікам пад літоўскім уплывам, паколькі ў літоўскай мове не адрозніваліся гукі [і] і [у] (гл. Зинкявичюс 1996, 73). Таму блытаніна гэтых літар сустракаецца ў многіх паўночнабеларускіх і літоўскіх помніках «руськага» пісьменства, дзе ўкраінскага ўплыву няма зусім. Відаць, у сувязі з гэтым стаіць і ўласцівая амаль усім «руськім» помнікам блытаніна ў каранях такіх слоў, як *ныне* ~ *нине*, *тисеча* ~ *тисеча*, *дыра* ~ *дыра* (апошняя пара ўласціва таксама царкоўнаславянскаму пісьменству). Па-другое, у некаторых выпадках блытаніна гэтых літар абумоўлена фаналагічнымі асаблівасцямі беларускай мовы: зацвярдзеннем *r'* (адсюль шматлікія хістанні кшталту *крити* ~ *крыти*, *риза* ~ *рыза*, *который* ~ *которий*, *добрый* ~ *добрий*), шыпячых і *с'* (адсюль хістанні кшталту *моцы* ~ *моци*). Па-трэцяе, няма ўкраінскага ўплыву ў хістанні канчаткаў асобных іменных формаў, дзе ў множным ліку выступалі ранейшыя родавыя канчаткі: а) Н. мн. л. назоўнікаў кшталту *народы* ~ *народи*, *ангелы* ~ *ангели*, *ризы* ~ *ризи*; б) Н. мн. л. (дзее)прыметнікаў кшталту *готовы* ~ *готови*, *видены* ~ *видени*. Сюды трэба аднесці і хістанне канчаткаў у старых формах Т. мн. л. кшталту *делы* ~ *дели*, якое адзначаецца ў Чэцці. У помніку якраз

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУ

прысутнічаюць толькі акрэсленыя вышэй выпадкі: *ныне ~ нине*, *тисящь ~ тысячами*; *рикающа*, *крилъ*, *злыи ~ злии*, *святыи ~ святии* і пад. (Карпинский 1889, 69), якія не магчыма аднесці на кошт украінскага ўплыву (гл. Гринчишин 1995, 266), а трэба лічыць вынікам марфалагічнага выраўноўвання. Украінскім даследчыкам трэба быць больш абачлівымі ў сваіх высновах і не ўсялякую блытаніну літар **і/и ~ ы** (асабліва калі яна адзначаецца толькі ў пэўных марфалагічных формах) прызнаваць украінізмам.

Таксама памылковай з'яўляецца выснова наконт украінскага паходжання ўжывання *и* замест *о* ці *е* ў такіх словах Чэцці, як *апустолом*, *(архи)епискуп(ство)*, параўн.: *архиепискупа*; *откуль/откуле*, *оттуль/оттуле*, *отсюль/отсюле*, а таксама ў формах *занюжь/зануж*, *нюжли/нужли* (Гринчишин 1995, 267; Воронич 2008, 44). Гэта штучнае аб'яднанне абсалютна розных выпадкаў, толькі знешне падобных да ўкраінскага «укання», але насамрэч ніякай сувязі з ім не маючых. У некаторых украінскіх дыялектах сапраўды назіраецца пераход *о*, *е* > *и*, але толькі ў пэўнай фанетычнай пазіцыі: у закрытым складзе, перад складам са слабым рэдукаваным галосным (гл., напрыклад, Клімаў 2009, 150). Таму выпадкі кшталту *архиепискупа*, *откуле*, *оттуле*, *отсюле* ўжо ніяк не могуць тлумачыцца як такія ўкраінізмы. Яны ўяўляюць сабой хутчэй факты лексікі: прыслоўі *откуль/откуле* і пад. калі не з'яўляюцца паланізмамі, то маюць суфікс *-уль/-уле* (параўн. бел. *адкуль*, *адтуль*, *дасюль*, *адсюль* і пад.), у грэцызмах грэч. *ō* ў царкоўнаславянскай мове нярэдка перадаваўся літарай **у**, вынікам чаго былі формы *епискупъ*, *Соломунъ*, *икуна* 'ікона', *номоканунъ* і пад., параўн. таксама польск. *biskup*, бел. *біскуп*. Напісанне *апустолом* можа быць апіскай або абумоўлена паўднёваславянскім уплывам (параўн. сербск. *апустол*, *апустолски*). Словы *занюж*, *нюжли* ў сваім складзе маюць заканамерную форму В. адз. л. ж. р. адноснага займенніка *иже*, якая пасля прыназоўніка, найчасцей пасля *въ* (< *vъn), атрымала ўстаўку *-n-* (параўн. суадноснае црксл. *въ ню*), а напісанні *зануж*, *нужли* – іх дыспалаталізаваныя варыянты, што ўзніклі, відаць, пад паўднёваславянскім уплывам (блытаніна літар **у ~ ю**, **а ~ я** і г. д. уласцівая многім сербскім і заходнебалгарскім (македонскім) помнікам). Думка пра «уканне» ў гэтых формах належыць У. Перацу (гл. Перетц 1928, 6, 24) і нарадзілася, відаць, пры памылковым суаднясенні іх з царкоўнаславянскімі злучнікамі *зане(ж)*, *неж(е)ли*; размовы пра дыфтангічны характар гука тут (гл. Воронич 2008, 44) увогуле беспадстаўныя.

Іншыя фанетычныя асаблівасці помніка, што абвяшчаюцца ўкраінскімі, насамрэч не ўласцівыя асноўнаму масіву ўкраінскіх гаворак і адзначаюцца ў ім на перыферыі ці спарадычна ў некаторых гаворках. Да такіх рыс адносяцца адлюстраванне асіміляцыйнай глухасці: *свѣтки*, *свѣтчить* (насамрэч, гэтае слова са спалучэннямі *тк*, *тч* – устойлівае напісанне актавай мовы (гл. Клімаў 2009, 151) і еканне: *светые*, *жедаеш*, *уведати*, *помнечи*, *терпечи*, *говоречи*, *тисечника*, *ерополк* і пад. (Карпинский 1889, 67; Гринчишин 1995, 271–272; Воронич 2008, 43–44; Воронич 2008 [а], 246–247). Апошняя рыса ўласціва амаль усім «руськім» помнікам канца XV – сярэдзіны XVII ст. (аднак адзначаецца з канца XIV і да пачатку XVIII ст.), але наўрад ці мае дыялектнае паходжанне (насуперак думцы большасці ўкраінскіх лінгвістаў, хаця некаторыя з іх лічаць яе беларусізмам (гл. Півторак 2007, 767)). Вялікага значэння не маюць выпадкі адлюстравання ў Чэцці мяккасці *с'*: *венець*, *месяць*, *девицю*, *темницю* і пад. (Гринчишин 1995, 268–269) – гэта можа быць толькі правапіснай тэндэнцыяй (параўн. паланізм *моць* з такім напісаннем), тым больш, што ў помніку зрэдку сустракаюцца напісанні і формы, якія адлюстроўваюць зацвярдзенне гэтага зычнага: *девица*, *пятница*, *творца*, *борца*, *борцомъ*, *молодцы* і інш. Ці варта казаць, што абедзве пастаці – і з мяккім *с'*, і з зацвярдзелым (таксама як і *r'* – *r* (гл. Гринчишин 1995, 261–262)) – лінгвісты Украіны прызнаюць украінскім уплывам (цікава, як яны маглі спалучацца ў маўленні адной асобы?).

Рэдкія выпадкі гіперычнага окання (*распадолося*, *борана*, *двожды* і пад.) украінскімі вучонымі лічацца асаблівасцю правабярэжных ніжненадпрыпяцкіх палескіх гаворак, даследаваных у свой час Т. Назаравай (гл. Гринчишин 1995, 259; Воронич 2008, 43), хаця гэтая арфаграфічная з'ява ўласцівая ўсім беларускім помнікам, а таксама маскоўскаму пісьменству. Больш частыя выпадкі акання (*багата*, *вчарашнии*, *ласкаво*, *карамольное*, *моланья*, *подабаеть*, *паганым*, *радаватися* і пад. (Карпинский 1889, 68; Перетц 1928, 24)) у Чэцці вельмі праблематычна звязаць з украінскім уплывам (гл. Гринчишин 1995, 270–271; Воронич 2008, 42–43; Воронич 2008 [а], 245–246), паколькі ва ўкраінскай мове нешматлікія выпадкі акання (толькі ў пераднаціскным складзе) кшталту *багатий*, *гаразд*, *гарячий*, *хазяїн* маюць выключна лексікалізаваны выгляд і прызнаюцца вынікам беларускага ўплыву (гл. Півторак 2007, 767). З аканнем не маюць нічога агульнага выпадкі ўжывання *-а-* ў каранях дзеясловаў незакончанага трывання (*розмавляти*, *помагати*, *ламати*, *выганяти*, *розмнажати* і пад.), якія беларускія даследчыкі дружна лічаць праявам акання, – такія формы насамрэч абумоўлены польскім уплывам і адзначаюцца ў польскіх помніках (*rozmawiać*, *pomagać*, *łamać*, *wyganiać*, *rozmnażać* і пад. (Клімаў 2009, 151)). Доказам акання таксама не павінны служыць запазычанні кшталту *манастырь*, *карабль*, *панамарь* і пад., дзе вы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

карыстанне галосных было нестабільнае. Яканне ў помніку, сапраўды, прадстаўлена нешматлікімі і непаказальнымі выпадкамі: *вясло*, *вясла* і *ягиптяны* (Карпинский 1889, 67–68; Воронич 2008, 42; Воронич 2008 [а], 245), якія могуць мець марфалагічнае (але наўрад ці фанетычна-дыялектнае, як спрабуе давесці Г. Вароніч (гл. Воронич 2008, 42; Воронич 2008 [а], 245)) ці чыста арфаграфічнае тлумачэнне (непаслядоўнасць перадачы галосных у запазычанні).

Ужыванне літары **е** на месцы **і/и**, якое абвешчана ўласцівасцю ўкраінскіх паўднёва-заходніх гаворак (гл. Гринчишин 1995, 268), можа быць вытлумачана як кантамінацыя розных асноў: *седели*, *седит* (параўн. бел. *седзячы*), *зберуть* (параўн. царксл. *съберутъ*, *соберутъ*), *детя* (адз. л.) – відаць, пад уплывам формы мн. л. *дети*; *тредневного* (блытаніна розных асноў *три-* і *тре-*). У словах *резоемству*, *резоемци* ў першым корані хутчэй за ўсё мае месца кантамінацыя (народная этымалогія перапісчыка?) розных слоў *риза* ‘вопратка’ (адкуль царксл. *ризоимство* ‘ліхвярства’) і *реза* ‘ліхва, працэнты’ (літаральна – тое, што адрэзана). У слоўніку У. Даля (гл. Даль III, 1769) слова *реза* ў гэтым значэнні падаецца з пазнакай «смаленскае» і прыводзіцца прыклад з перакладу Бібліі: *еже резы имати или лихоимство*. Другі корань слова *резоем-* мае заканамерны варыянт з *-е-* (параўн. бел. *спадкаемства*, *спадкаемца*, царксл. *преемникъ*). Канчатак *-ей* у форме *дмитрей* мае агульнаўсходнеславянскае распаўсюджанне (адзначаецца таксама ў маскоўскіх помніках: *Остафей*, *Василей* і пад.). Адваротная з’ява, ужыванне літары **і/и** на месцы **е**, прызнана рысай украінскіх паўднёва-заходніх, у прыватнасці, наддністранскіх гаворак: у слове *мертвиц* (*мертвица*, *мертвици*, *мертвицю*, *мертвицов*), *отверичися*, *клинися*, *завтрини*, *стримглав* (Гринчишин 1995, 268), хаця ў такой самай ступені яна можа быць абумоўлена і ўплывам беларускіх паўночна-ўсходніх гаворак. Насамрэч, у гэтых напісаннях наўрад ці можна бачыць дыялектны ўплыў увогуле. Слова *мертвиц(а)* – рэдкі словаўтваральны варыянт царкоўнаславянскай мовы (усходнеславянскай рэдакцыі) да слова *мертвец* і сустракаецца, напрыклад, у маскоўскім Ніканаўскім летапісе XVI ст. Такім самым варыянтам да царксл. *заутреня* з’яўляецца і слова *завтринь* ці *завтриня* ‘ютрань’, якое адзначаецца і ў маскоўскіх помніках (параўн. рус. *завтреня* ў слоўніку У. Даля (гл. Даль I, 1408) з пазнакай «ніжагародскае, кастрамское»). У іншых выпадках тут можна бачыць кантамінацыю: *трима* (параўн. бел. *трыма*), *клинися* (параўн. бел. *уклінаць*, *уклінанне*, рус. *заклинание*) ці нестабільнасць напісання галосных у грэцызмах: *сирофѣми*, *сирофѣмовъ*, *хировимомъ*.

Ужыванне марфалагічных формаў увогуле не можа быць крытэрыем размежавання беларускага і ўкраінскага ўплыву (гл. Клімаў 2009, 148–149, 152). Таму без усялякага значэння застаюцца адзначаныя факты выкарыстання канч. *-ови/-еви*, вядомага і беларускім помнікам, і беларускім дыялектам (у дадатак, у Чэцці не вывучана яго дыстрыбуцыя з канч. *-у/-ю*), ужывання клічнай формы – царкоўнаславянская рыса, канч. *-ии* ў Р. мн. л. назоўнікаў ж. р. былых асноў на *-ĭ-* (*пакостий*, *скорбий*) – апошняе можа быць абумоўлена царкоўнаславянскім уплывам, а не ўкраінскім дыялектным (гл. Гринчишин 1995, 270). Агульнаўсходнеславянскае (а зусім не ўкраінскае) распаўсюджанне маюць формы прыставак *рос-/роз-*, займеннікаў *тобѣ*, *собѣ*, канч. *-е* 3 ас. адз. л. дзеясловаў цяперашняга часу (*погибае*, *подае*, *не имае*, *увядае*, але форма *пожре* – аорыст) (Там жа). Хаця займеннік *сесь* адзначаецца ў некаторых паўднёва-заходніх гаворках украінскай мовы (гл. Перетц 1928, 8; Гринчишин 1995, 270), аднак уласцівы ён таксама і царкоўнаславянскай мове, а таму не можа мець дыягназуючага значэння. Паланізмам з’яўляецца фіналь *жч* у слове *дожчь*, параўн. *дожчю*. Польскім уплывам абумоўлена дыстантнае ці прэпазіцыйнае выкарыстанне зваротнай часціцы *ся/се* пры дзеяслове (што вядома таксама некаторым заходнеўкраінскім гаворкам, дзе, аднак, паступова занікае) – гэтая з’ява ўласцівая амаль усім «руськім» помнікам XVI–XVII стст., а не проста «характерна тільки для пам’яток української мови» (Воронич 2008, 46). Цікава, што іншыя марфалагічныя рысы, якія прызнаюцца лінгвістамі Беларусі беларускімі (канч. *-ью* ў Т. адз. л. назоўнікаў ж. р. былых асноў на *-ĭ-* (*завистью*, *мыслью*, *ночью*), канч. *-ое/-ее* ў Р. адз. л. прыметнікаў ж. р. (*горькое смерти*, *правое роуки* і пад.), канч. *-ые/-ие* ў Н. і В. мн. л. прыметнікаў (*правые рѣчи*, *лихие помыслы* і пад.), фіналь *-ть* 3 ас. адз. і мн. л. дзеясловаў цяперашняга часу (*видеть*, *висить*, *горить*, *молчать* і пад.) і інш. (гл. Жураўскі 1967, 85–86)), украінскія даследчыкі лічаць супольнымі ўкраінска-беларускімі (гл. Гринчишин 1995, 272–273; Воронич 2008, 44–45). Чаму ж такая непаслядоўнасць? Чаму ўкраінскае – гэта толькі ўкраінскае, а беларускае – гэта яшчэ і ўкраінскае таксама?

Спробы і беларускіх, і ўкраінскіх даследчыкаў давесці тую ці іншую дыялектную прыроду Чэцці на падставе спецыфічнай лексікі (гл. Жураўскі 1967, 88; Жураўскі 1994, 617–618; Гринчишин 1995, 273–274; Воронич 2008, 45–46) увогуле выглядаюць наіўна. Лексіка беларускіх і ўкраінскіх помнікаў «руськага» пісьменства была амаль цалкам агульнай (гл. Клімаў 2009, 148), а вузкія лакалізмы пакуль мала вывучаны, каб на іх падставе можна было рабіць нейкія размежаванні помнікаў. У дадатак, у Чэцці шмат рэдкіх ці варыянтных слоў (*пѣтье* пры *пѣніе*, *боротье* пры *боротьба* і інш. (Карпинский 1889, 84)), якія могуць здавацца дыялектызмамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

Падводзячы вынікі «ўкраінізацыі» Чэцці 1489 г., трэба заключыць, што яны не толькі непераканаўчыя, але і проста памылковыя. Папершае, даследчыкі для інтэрпрэтацыі тых або іншых з'яў прыцягваюць не ўвесь магчымы матэрыял, а толькі той, што здаецца ім падыходным (ці ўвогуле проста ім знаёмы), у асноўным дыялектны. Слаба ўлічваецца моўны сінкрэтызм помніка, марфалагічная і словаўтваральная варыятыўнасць «руськай» і царкоўнаславянскай моў. Па-другое, украінскія лінгвісты дапускаюць у сваёй метадалогіі пэўную павярхоўнасць: рысы помніка супастаўляюцца з асаблівасцямі ўсіх гаворак украінскай мовы, што прыводзіць не да яго дыялектнай інтэрпрэтацыі, а да стварэння хутчэй эклектычнай мазаікі механістычна адабраных рыс. Атрымліваецца, што ў гаворцы перапісчыка сумяшчаліся рысы ці не ўсіх украінскіх гаворак (Падляшша, Валыні, Галічыны, Падолля, Ніжняга Папрыпецця), што інакш як моўнай ідыясінкразіяй назваць і нельга. Праўда, адных гаворак там толькі няма – беларускіх. Такі падыход, натуральна, вельмі патрыятычны, аднак ён ненавуковы. На яго падставе нельга ні рэканструяваць дыялект перапісчыка (аўтара), ні высветліць ранейшыя або пазнейшыя дыялектныя ўплывы на мову помніка (у выпадку яго неаднаразовай перапіскі).

Таму настолькі неадназначнымі выглядаюць высновы ўкраінскіх даследчыкаў наконт дыялектнай лакалізацыі Чэцці. Нягледзячы на даволі выразныя экстралінгвістычныя падставы звязваць маўленне перапісчыка (ці яго пратографа) з Берасцейшчынай або Падляшшам (калі прыкрая сама думка пра беларускую аснову яго гаворкі, хаця А. Жураўскі бачыў у ёй паўднёва-заходні беларускі дыялект (гл. Жураўскі 1967, 86–87; Жураўскі 1994, 617)), украінскія лінгвісты ўпарта змяшчаюць яго на Валыні і Галічыне (гл. Гринчишин 1995, 275; Воронич 2008, 47; Воронич 2008 [а], 248). Тут яны некрытычна ідуць услед за ранейшымі вучонымі, якія прымалі многія асаблівасці помніка за ўкраінізмы (гл. Карпинский 1889, 86; Перетц 1928, 6, 29–30). Як было паказана, падстаў для гэтага няма ніякіх, таму на парадак дня выходзіць аб'ектыўнае і сістэматычнае даследаванне мовы цікавага помніка супольнага пісьменства даўніх беларусаў і ўкраінцаў.

ЛІТАРАТУРА

Воронич Г. Четья Мінея 1489 року: Українсько-білоруська мовна дискусія // Українська мова. 2008. № 3. С. 41–47.

Воронич Г. В. Про фонетичні риси білоруської мови у Четьї-Мінеї 1489 року // Дыялекталогія і гісторыя беларускай мовы: Матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 15–16 крас. 2008 г. Мн., 2008 [а]. С. 244–249.

Гринчишин Д. Четья 1489 року – видатна конфесійна пам'ятка української мови // Записки Наукового товариства ім. Шевченка: Праці філологічної секції. Львів, 1995. Т. 229. С. 251–276.

Даль В. Толковый словарь живого великорусского языка: В 4 т. / Под ред. И.А. Бодуэна-де-Куртенэ. 3-е изд. СПб.; М., 1903. Т. 1; 1907. Т. 3. (Репринт. М., 1994).

Жураўскі А. І. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы. Мн., 1967. Т. 1.

Жураўскі А. І. Чэцця 1489 г. // Беларуская мова: Энцыкл. Мн., 1994. С. 617–618.

Зинкявичюс З. Восточная Литва в прошлом и настоящем. Vilnius, 1996.

Карпинский М. Западнорусская Четья 1489 года с приложением жития Бориса и Глеба // Русский филологический вестник. 1889. Т. 21. С. 59–107.

Клімаў І. П. Да праблемы размежавання ўкраінскіх і беларускіх помнікаў старажытнага пісьменства // Беларускі археаграфічны штогоднік. Мн., 2009. Вып. 10. С. 134–157.

Перетц В. Н. К изучению Четьи 1489 г. // Перетц В.Н. Исследования и материалы по истории старинной украинской литературы XV–XVIII веков. Л., 1928. С. 1–107. (Сборник по русскому языку и словесности АН СССР. Т. 1. Вып. 1).

Півторак Г. П. Українсько-білоруські мовні контакти // Українська мова: Енциклопедія. 3 вид., зі зм. і доп. Київ, 2007. С. 766–767.

Свяжынскі У. Аб статусе беларускай і ўкраінскай моў у часы Вялікага Княства Літоўскага // Metriciana: Даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага. Мн., 2003. Т. 2. С. 132–163.

Паступіў у рэдакцыю 18.10.12.

*Ігар Паўлавіч Клімаў* – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры БДУ культуры і мастацтваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ